**Комплексная работа з тэкстам па тэме**
**“Клопат пра тых, хто навокал”**

## Верныя гаспадары

Жылі-былі дзед і баба. Аднойчы яны паехалі ў госці. Гаспадарамі пакінулі Гаўкалу, Мяўкалу і Кукарэкалу.

Гаўкала вартавала двор. Мяўкала ганяў мышэй у хаце. Кукарэкала шукаў зярняткі, каб пакарміць сваіх сяброў.

Раптам над хатай паказалася Каркала. Кінулася да зямлі, ухапіла жоўценькага Ціўкалу. Кудахтала-мама загаласіла:

— Куд-куды-а?.. Куд-куды-а?..

Каркала з Ціўкалам у дзюбе ўзляцела на дуб, які рос на агародзе ў дзеда і бабы. Села на галінку і сабралася есці здабычу.

Гаўкала знізу пачаў страшыць Каркалу:

— Гаў-ў, гаў-ў!.. Ад-дай!..

Кукарэкала растапырыў крылы, тупаў нагамі і злосна крычаў:

— Ку-ка-рэ-ку!.. У-рэ-ку!.. У-рэ-ку!

Каркала падумала, што яе хочуць скінуць у раку, спалохалася. А ў гэты момант Мяўкала ўзлез на дуб. Ціхенька падкраўся да зладзейкі ды… цоп кіпцюрыстай лапай за хвост.

— Кар-кар-кар-авул! — закрычала Каркала, выпусціла з дзюбы здабычу і паляцела ў лес.

Жоўценькае Ціўкала злавілі ўнізе Гаўкала і Кукарэка– ла. А Мяўкала злез з дуба. У роце трымаў пёркі з хваста зладзейкі. Сябры прывялі Ціўкалу да Кудахталы.

Усе радаваліся, што перамаглі Каркалу. Вярнуліся з гасцей дзед і баба. Пачаставалі сваіх верных гаспадароў…

У. Ліпскі

ПІ ____________________________________________

1. Адзнач правільны адказ, каб закончыць наступны сказ. Гэты тэкст адносіцца да…

А. верша Б. казкі В. апавядання

2. Выпішы з тэксту мянушкі галоўных герояў.

______________________________________________
______________________________________________
______________________ ________________________

3. Хто з’яўляецца сябрамі Кудахталы? Адзнач правільныя адказы.

А. Гаўкала В. Каркала
Б. Ціўкала Г. Кукарэкала

4. Падкрэслі ў тэксце сказы, выразы, якія даказваюць, што Каркала — зладзейка.

5. Чым Кукарэкала хацеў накарміць сваіх сяброў? Адзнач правільныя адказы

А. зярняткамі
Б. насеннем
В. аўсом

6. Прачытай урывак з тэксту. Падкрэслі памылкі.

Мяўкала ўзлез на вяз, які рос у садзе ў дзеда і бабы. Ціхенька падкраўся да Каркалы ды… цоп мяккай лапай за крыло.

— Кар-кар-кар-авул! — закрычала зладзейка, выпусціла з кіпцюроў здабычу і паляцела прэч.

7. Што адчувала Кудахтала, калі Каркала ўхапіла Ціўкалу? Адзнач правільныя адказы

А. страх Г. хваляванне
Б. радасць Д. падзяку
В. трывогу Е. гнеў

8. Чым, на тваю думку, дзед з бабай частавалі сваіх верных гаспадароў? Запішы.

| | |
|---|---|
| Гаўкалу | |
| Мяўкалу | |
| Кукарэкалу | |
| Кудахталу | |
| Ціўкалу | |